# АПАВЯДАННЕ ПА СКАЗЕ ЯК МЕТАДЫЧНЫ ПРЫЁМ НА ЎРОКУ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***Шылько Таццяна Мікалаеўна,***
*загадчык кафедры педагогікі і прыватных методык*
*ДУА “Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

Успрыманне мастацкага тэксту патрабуе ад вучняў пачатковых класаў гатоўнасці да разважання над ім, да яго аналізу, своеасаблівай сатворчасці пісьменніка і чытача. Аналіз мастацкага тэксту асаблівы, эмацыянальны і надзвычай прадуктыўны спосаб пазнання, у якім закладзены вялікія метадычныя магчымасці.

Пытанні і заданні, якія прапануе настаўнік вучням, павінны пастаянна знаходзіцца ў пошуках адкрыцця “сакрэтаў” мастацкага тэксту, вучыць вучняў выказвацца ў вуснай і пісьмовай формах, уступаць у дыскусію, аргументаваць сваё выказванне з апорай на тэкст, спасцігаць мудрасць жыцця, закладзеную ў мастацкім слове.

На працягу дзесяцігоддзяў развіцця метадычнай думкі вядуцца пошукі эфектыўных метадаў і прыёмаў, накіраваных на фарміраванне “творчага” чытача, які валодае высокай інтэлектуальнай і духоўнай актыўнасцю.

У распрацаваных сучасных методыках на этапе датэкставай работы аўтары рэкамендуюць выкарыстоўваць прыём антыцыпацыі, які дазваляе вучню зазірнуць у будучыню, будаваць верагодныя прагноз, дзякуючы якому ідзе падрыхтоўка да ўспрымання тэксту. Пабудова такога прагнозу залежыць ад мінулага вопыту, які захоўваецца ў памяці, і сёняшніх дзеянняў чалавека. Пры гэтым ажыццяўляюцца інтэлектуальныя аперацыі, пабудова гіпотэз, афармленне іх з дапамогай механізмаў знешняга і ўнутранага маўлення.

Праверка правільнасці здагадак цесна зліваецца з праверкай першаснага ўспрымання твора, пры гэтым вучні не толькі выказваюць уражанні аб праслуханым творы, коратка ўзнаўляюць сюжэт, але і правяраюць свае прагнозы.

Схільнасць дзяцей да рознага роду верагоднаснага прагназавання шырока і паспяхова выкарыстоўваецца падчас работы з кнігай і тэкстам у тэорыі фарміравання прадуктыўнай чытацкай дзейнасці. Значэнне і асаблівасці арганізацыі прагназавання для дыялога з тэкстам адлюстраваны ў працах С.М. Бандарэнка, Г.Г. Гранік, В.У. Собалевай і іншых [1, 2]. У пачатковых класах шырока выкарыстоўваецца прыём антыцыпацыі пры прагназаванні зместу твора па яго назве, ілюстрацыі, прозвішчу аўтара і новым словам, з якімі вучні знаёмяцца да чытання твора.

Прагназаваць разгортванне падзей і тым самым стымуляваць у вучняў пазнавальную актыўнасць можна праз выкарыстанне яшчэ аднаго прыёма, апісанага ў метадычнай літаратуры [1, 2], – складанне апавядання па сказе.

Пачынецца складанне апавядання з расшыфроўкі сказа – здабывання інфармацыі, якая ў ім закладзена. Адзначаецца, што для расшыфроўкі сказа трэба зразумець сэнс кожнага слова і словазлучэння і запоўніць тэкставыя “скважыны”. Калі ўсё, што ўдалося “вычарпаць” са сказа, прадставіць у выглядзе звязнага тэксту, то атрымаецца апавяданне па сказе. Пры яго складанні можна актыўна выкарыстоўваць сінанімічныя замены, але нельга прыдумываць тое, аб чым нельга даведацца са сказа.

В.У. Собалева прапануе знаёміць вучняў з прынцыпам выканання задання так: “Уявім, што ў нас у руках чарадзейная палачка, з дапамогай якой можна ператварць вялікія прадметы ў маленькія, а маленькія – у вялікія. Паспрабуем чарадзейную сілу палачкі і ператворым адзін сказ у цэлае апавяданне”.

Праілюструем выкарыстанне прыёма на прыкладзе работы са сказам з тэксту П. Ткачова “Хітрун” (4 клас). Знаёмім вучняў са сказам: “А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты”. Ставім мэту: па сказе скласці апавяданне.

Гутарка з вучнямі:

Н.: З чаго пачнём апавяданне? Напэўна, трэба высветліць, пра каго ідзе гаворка ў сказе.

В.: Пра таго, хто разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты.

Н.: А што значыць “што меў сілы пабег”?

В.: Пабег вельмі хутка.

Н.: Як можна яшчэ сказаць?

В.: З усіх ног.

Н.: А калі ён пабег?

В.: Калі крокі дзяўчынкі заціхлі.

Н.: А што гэта значыць “крокі дзяўчынкі заціхлі”?

В.: Дзяўчынка была і пайшла. Яе няма на гэтым месцы.

Н.: Значыць, наш герой што меў сілы пабег дадому тады, калі крокі дзяўчынкі заціхлі. Так? Што можна сказаць пра героя?

В.: Напэўна, ён баяўся дзяўчынкі.

Н.: Дзяўчынка ж маленькая. Хто яе можа баяцца?

В.: Той, хто меншы, слабейшы за яе.

Н.: Давайце яшчэ раз звернемся да сказа. Што яшчэ рабіў наш герой?

В.: Ён разгарнуўся.

Н.: А што гэта значыць? Падбярыце сінонім.

В.: Раскрыўся.

Н.: А якое адаротнае ёсць дзеянне. Падбярыце антонім.

В.: Закрыўся, скруціўся.

Н.: Што мы даведаліся пра героя?

В.: Што ён маленькі, баіцца дзяўчынкі, можа скручвацца і разгортвацца.

Н.: Дык хто ж гэта такі? Якія вашы меркаванні?

В.: Гэта вожык.

Н.: Дакажыце.

В.: Вожак маленькі, калі існуе небяспека, то скручвецца ў клубок.

Н.: Мы з вамі высветлілі, што ў сказе гаворыцца пра вожыка. Каб скасці пра яго апавяданне, мы павінны звярнуць ўвагу яшчэ на адно слова – “Потым”. Як вы думаеце, што было раней?

(Тут важна, каб вучні не адыходзілі ад сказа, а карысталіся толькі той інфармацыяй, якая ў відавочным ці скрытым выглядзе пададзена аўтарам).

В.: Вожык убачыў дзяўчынку, спужаўся і скруціўся ў клубок.

Н.: Давайце абагулім нашы меркаванні. Мы вырашылі, што размова ў сказе ідзе пра вожыка, які спалохаўся дзяўчынкі і скруціўся ў клубок. А калі дзяўчынка пайшла, ён разгарнуўся і хуценька пабег дахаты.

Затым настаўнік прапануе вучням прадставіць уласныя невялікія тэксты. Звяртае ўвагу на магчымасць выкарыстання сінонімаў: спужаўся – спалохаўся; заціхлі крокі – перасталі быць чутнымі; што меў сілы пабег – пабег з усіх ног, што ёсць духу, без агляцкі; дахаты – дадому.

Работа можа быць выканана як індывідуальна, так і ў парах.

Вынік працы можа быць прадстаўлены ў табліцы.

| Сказ | Тэкст |
|---|---|
| А потым, калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты | Аднойчы вожык убачыў у лесе дзяўчынку. Ён вельмі спалохаўся і скруціўся ў клубок. А калі крокі дзяўчынкі заціхлі, разгарнуўся і што меў сілы пабег дахаты. |

Як бачна, тэкст складзены на аснове ўмення працаваць не толькі з фактуальнай інфармацыяй – пададзенай у сказе ў відавочным выглядзе. Для складання звязнага выказвання спатрэбілася ўстанавіць сувязь, не выказаную ў тэксце адкрыта, асэнсаваць падтэкст і на аснове гэтага рабіць простыя вывады.

Такога віду праца садзейнічае павышэнню ў вучняў цікавасці да чытання, падаграе іх чаканне сустрэчы з наступнай інфармацыяй з тэксту. Калі вучні навучацца разгортваць сказ, то яны будуць добра разумець і выяўляць не толькі відавочную інфармацыю, але і падтэкставую, якая ўтойвае ў сабе скрыты сэнс, вучыцца ўважліва адносіцца да кожнага слова і словазлучэння, да фразеалагізмаў і знакаў прыпынку. Пры гэтым вучні трэніруюць сваю зрокавую памяць, а гэта значыць, развіваюць арфаграфічную пільнсць, назіральнасць. Акрамя гэтага вучні пры такой рабоце ўключаюцца ў навучальны дыялог, які паступова падводзіць удзельнікаў да рашэння пастаўленай задачы, ажыўляе дзіцячыя прадстаўленні, вымушае іх уключыцца ў маўленчую дзейнасць, што спрыяе развіццю інтэлектуальна-творчай і камунікатыўнай культуры асобы вучняў.

Такім чынам можна сцвярджаць, што складанне апавядання па сказе – эфектыўны прыём работы з інфармацыяй, уменне працаваць з якой разглядаецца як універсальнае вучэбнае дзеянне, накіраванае на стварэнне

ўмоў для самастойнага паспяховага засваення новых ведаў, уменняў і кампетэнцый.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Граник, Г. Г. Дорога к книге / Г. Г. Граник, С. М. Бондаренко, Л. А. Концевая. – М. : НПО «Образование», 1996. – 127 с.

2. Соболева, О. В. Беседы о чтении (К проблеме понимания текста) / О. В. Соболева // Начальная школа плюс До и После. – 2011. – № 7. – С. 23–30.